Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. 16 Красавіка 1915 г. № 15

## Наша павіннасьць.

Як вядома с тэлеграмоў Вярхоўнаго Глаўнакамандуючаго, ешчэ ў лютым немцы памкнуліся падыйсьці пад Гродно. Пасьля крывавых бітвоў яны, праўда, адыйшліся. Але там, дзе йшлі тые бітвы, асталася голая пустыня: ад гарматніх стрэлоў, ад пажароў зьністожэна ў тым баку ўсё, счэзьлі вёскі і сёлы...

Паплыла кроў па гонях беларускіх. Вайна ступіла на нашу зямлю, — а за ёй сьледам залуналі над хатамі хлебаробоў беда, голад.

Дагэтуль ад вайны найбольш цярпелі палякі і жыды, украінцы і літвіны: вайна ішла бадай увесь час на іх землях. І ўсе гэтые народы пачалі ўраз-жэ працаваць, не пакладаючы рук, каб даць якую помач сваім братом, пацярпеўшым ад вайны. Пазакладаліся камітэты і таварыствы дзеля гэткай помачы—польскіе, жыдоўскіе, літоўскіе і іншые. Работа закіпела.

Ад нас, беларусоў, вайна была далёка, і мы не рупіліся стварыць сваю організацію дзеля падмогі ахвярам вайны. Цяпер яна закранула і наш народ.

Вось, у Вільні грамадка беларусоў і надумала, што настаў час і для нас скрануцца з мейсца ды пайсьці па сьлядох нашых суседзёў і братоў. Яны выпрацавалі статут «Беларускаго Таварыства дзеля помачы ахвярам вайны», і гэтымі днямі губэрскае прысуцтва яго зацьвярдзіла.

Таварыство ставіць сабе такіе мэты. Яно маніцца працаваць у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілеўскай і Вітэбскай губэрнях, —у адных затым, што там патрэбна падмога зруйнаваным селянскім гаспадаркам на мейсцы, у другіх — затым, што туды панаехала бедната, у каторай дома не асталося прыпынку, не асталося, як кажуць, ні двара, ні кала... Да таварыства могуць належаць усе, хто ахвоч да працы і каму закон таго не бароніць. С пяці членоў таварыства у асобных гарадох і мястэчках будуць аткрывацца аддзелы таварыства, каторые у сваім куце і займуцца апекай над пацярпеўшымі ад вайны, — як і чым мага.

Беларускае грамадзянство павінно шчыра атклікнуцца на кліч аб помачы братом нашым. Гэта — наша сьвятая павіннасьць. Ніхай па сёлах і валасьцёх нашы селяне пастановюць прыгаворы, каб з грамадзкіх грошы даць частку на работу Беларускаго Таварыства дзеля помачы ахвярам вайны. Ніхай збудзяцца нашые хаўрусные крамы, нашы мястэчковые і вясковые банчкі і з сваіх даходоў памогуць у вялікай і патрэбнай працы дзеля змаганьня з бядой і нешчасьцем людзкім. Ніхай адгукнуцца і ўсе паадзінокіе беларусы, каторым удалося стануць цьвёрда на ногі і здабыць сякое-такое багацьце. Калі ўсе мы, ўсё беларускае грамадзянство паруміцца, дык і помач будзе вялікая і мы споўнім сваю павіннасьць перад беларускім народам, перад тымі сынамі яго, каторых ліхая доля пакрыўдзіла.

Новае таварыство пачне акуратна працаваць ад першых дзён мая, як адбудзецца першы агульны сход.

**а—н—а.**

---

## ВАЙНА.

**На Ўсходнім фронце.** *У Галіччыні на Карпатах* вялікіе бітвы усё яшчэ не спыняюцца. Гэтак, 6 красавіка праціўнік безкарысна атакаваў расейскіе пазыціі ў районі верхней Яблонкі і Полена. Асабліва заўзятым было наступленьне непрыяцеля на ўзятую намі высоту каля Полена. Страты праціўніка вельмі вялікіе. У Заходняй Галіччыні, непадалёк ад Горліц, ў ночы на 7 красавіка расейцы аткінулі атаку аўстрыякоў. 7 і ў ночы на 8 красавіка аўстрыякі мецілісся атакаваць расейскіе пазыціі у Карпатах на фронце Тэлепоч — Руньіна. Наступленьне праціўніка было адбіта расейскімі проці-атакамі, даходзіўшымі да схватак на штыхі. З вялікімі стратамі праціўнік адыйшоў на свае пазыціі. 8 красавіка на Лютовіскім напрамку расейцы карысна пасунуліся наперад, заўладаўшы часьцяй непрыяцельскіх акопоў на высаце «1001» і к поўнача-ўсходу ад вёскі Лубня. У ночы на 9 красавіка праціўнік перайшоў ў наступленьне на фронце Лубня —Буковец—Сянкі, але ўсюдах меў неўдачу і быў аткінуты з вялікімі стратамі. 9 і ў ночы на 10 красавіка аўстрыякі пасьля сільнай гарматняй стрэлянін з вялікіх гармат, зрабілі колькі атакоў на займаные расейцамі высоты ў районі Полена, але былі адбіты з вялікай для іх стратай. Так сама не ўдалася проба аўстрыякоў атакаваць днём 10 красавіка расейскіе пазыціі у районі Волосатэ. За мінуўшые суткі расейцы карысна пасунуліся наперад у районі Тэлепоча і к поўдня-ўсходу ад Сянкі. Расейскае войска пасьля заўзятых бітвоў здабыло ў гэтых районах некольні важных высот. У ночы на 11 красавіка праціўнік зрабіў некольні заўзятых атак ў районі перэвалу Ужок. Атакі гэтые былі адбіты расейскай стрэлянінай і ручнымі гранатамі. Страты праціўніка вельмі вялікіе. 11 красавіка на высотах каля Палена расейцы карысна атціснулі праціўніка. На Стрыйскім напрамку 11, 12 і 13 красавіка ідзе страшэнна заўзятая бітва. 12 красавіка непрыяцель, пасьля сільнай гарматняй стрэланіны, штурмаваў высоты к поўнача-ўсходу ад Орош —Паток. Атаковываючые атрады дайшлі да драцяных загародоў, але тут былі разсеяны расейскай стрэлянінай. У ночы на 13 красавіка непрыяцель вёў безкарысные атакі ў районі к поўнача-захаду і к усходу ад Ужокскаго перэвала.

У *Нёманскім і Прывісьлянскім* районі асабліва важных бітвоў не было. Толькі, як паведамляе Штаб, у ночы 11 красавіка немцы некольні раз мецілісся невялікімі сіламі атакаваць расейскіе пярэдніе атрады ў районі між Кальварыей і Людвіновым. Атакі гэтые былі лёгка адбіты расейскай стрэлянінай. Каля Осовца — час-ад-часу гарматняя стрэляніна. Карысная для расейцоў стычка адбывалася 12 красавіка на левым беразі Віслы, к поўдня-захаду ад Радошыцэ.

**На Каўказкім фронце і на Заходнім (францускім) фронце** — нічога важнаго.

**На моры.** 12 красавіка расейскі Чорнаморскі флот абстрэліваў украпленьні Босфора (праток між Чорным і Мрамарным морэм). Адзін с турэцкіх броненосцоў, быўшы ў пратоку безкарысна адстрэліваўся. Гатаго-ж самаго дня непрыяцельскі крэйсер безкарысна абстрэліваў дзьве вёскі на Палагенскім узбярэжы (не падалёк ад Лібавы).

У **паветры.** У ночы на 7 красавіка нямецкі самалёт кідаў на г. Цэханов бомбы, каторые аднак ніякай шкоды не зрабілі. Расейскіе самалёты карысна кідалі бомбы на станцію Сольдау. 11 красавіка раніцай расейскіе самалёты зрабілі карысны напад на станцію Найдэнбург, прычыніўшы ў ёй пажары і зруйнаваўшы жалезнадарожные устройствы. 12 красавіка раніцай нямецкі самалёт ізноў (гл. «З Бел. і Літвы») кінуў на г. Беласток некольні бомбоў, не прычыніўшых страты. Расейскі самалёт карысна кідаў бомбы ў нямецкіе самалёты, знайходзіўшыеся на стаянцы каля вёскі Саньнікі.

Відаць, добрая вясеньняя пагода шмат прычыняецца к таму, што так частымі сталі палёты і і налёты розных самалётоў у цяперашніх спосабах ваеваньня.

---

## Па сьлядох вайны*).

*Ад нашаго карэспандэнта.*

Вёска Я           ляжыць ля самаго балоцістаго Бобра.

Тутака была першая баевая сустрэча з немцамі. Аднаго дня пад вечар паказаўся нямецкі раз'езд, агледзеўшы ваколіцы і праканаўшыся, што у блізку німа расейцоў — гайда на Я         . У той час у вёсцы было трох казакоў. Ось, згледзеўшы прыбліжэньне 10 немцоў, казакі заселі у засаду, падпусьцілі блізка немцоў, дый давай паліць: пяцёх забілі, а рэшта уцекла. У вёсцы узняўся пажар. Немцы-ж, думаючы, што тутака шмат расейскаго войска, пачалі стрэляніну з гарматоў. А ў свой чарод агонь захапляў ўсё так хутка, што ледзьве пасьпелі паўцекаць с хат людзі; дабра не вынесьлі нічога, уся жывёла так сама згарэла. Усяго тутака спалена 50 дамоў, а з жывёлы: 5 коней, 300 кароў і 400 сьвіней. Жыхароў было: 150 мужчыноў і 282 кабеты.

Вясковая вуліца у даўжыню каля вярсты, дый поле у старану Бабра зрыты акопамі. Немцы колькі разоў перахадзілі Бобр вялікшымі сіламі, але далей гразкаго берэгу не давялося ім падыйсьці: расейскіе шрапнэлі, гранаты дый кулемёты зметалі людзей на сваей дарозі, і чырванеў цёмны Бобр ад крыві тых сьмельчакоў, што адважыліся перайсьці на Я
зямлю. У вярстах дзесяці ад гэтуль, каля вёскі Н          , на пашкоўскім мосьці была другая проба немцоў заўладаць Бобрам, але тутака ім яшчэ горш не пашчасьлівілася: расейцы падпусьцілі іх на блізкую мэту да сваіх акопоў, а пасьля аткрылі такі пякельны агонь, што с трох нямецкіх батальёноў (батальён 4 роты) засталася толькі невялікая кучка. І цяпераka адно высокіе магільные насыпы сьведчуць аб гэтым страшэнным пашырэньні сьмерці.

Сільна ад баёў пацярпелі вёскі: П          , В          і В
; усяго тутака спалілася 31 дом, жыхароў ў гэтых вёсках: 210 мужчыноў і 432 кабеты. Апрача таго згарэлі такіе вёскі: Б       —60 дамоў, С          —25, С          —40, П
—14, П          — 12, Т
10 дамоў. Усяго спалена тутака 161 дамоў; жыхароў жыло: 256 мужчыноў і блізка 600 кабетоў.

Гэтым пацярпеўшым ваколіцам цяжка жывецца: людзі без стрэхі і хлеба, а трэба ведаць, што тутэйшые селяне і так ледзьве перэкідаліся, а апошніе рэквізыціі, недахват зароботкоў, дый страшэнная дарагоўля зусім зглумілі тутэйшы народ. Калі да гэтаго усяго прымем пад увагу, што тутэйшы беларус яшчэ ня скінуў с сябе векавечнаго ярма рабства і чужой апекі, што сьвет навукі у роднай мові яшчэ не заясьнеў пад яго саламянай стрэхай,—дык зразумеем, як цяжка там прыходзіцца нашым братам без ніякіх арганізацій самопомачы, без суполак і коопэратывоў. І вось гэты момэнт як нельга лепей паказаў тым сьлепаком, што дагэтуль гэтаго не бачуць, або ня хочуць бачыць і зразумець, тую вялікую вагу, якую нясець у сабе незалежнае культурнае і эканамічнае жыцьцё народа.

З Н                    я паехаў шасою ў Д          ; ехаў бытцам па падлозі аж да самаго села Д
, і толькі аставалося яшчэ пад'ехаць бачком менш за поў вярсты, як ось ужо быў-бы чэлавек і ў горадзі. Але аказалася, што зрабіць гэта не так-то лёгка: с шасы мы адразу бухнулі у такое морэ балота, дый папалі адразу у гэтакую яму, што прыйшлося аж самім выцягіваць воз с пропасьці. Словам гэтые поў вярстры пад носам Д          мы цягнуліся блізка гадзіну часу.

Застаецца толькі дужэ дзівіцца с тутэйшых парадкоў: сяло ня беднае, гандлёвае, купцом заўсёды прыходзіцца тануць с таварамі ў гэтым чортавым возеры,—лаюцца і клянуць, а за работу ніхто не берэцца.

У Д          і ваколіцах шмат уцекачоў с С          , дый К          ; жывуць яны ў тамашніх селян у варунках стра-

---

*) Гл. «Н. Н.» № 14.

шэнна антысанітарных, бо прыходзілося спатыкаць хаты, дзе гнездзіцца па 7—8 сем'яў, дый яшчэ з дзецьмі. Усяго іх тутака больш за тысячу; найболей гэта бедата, што уцекла, як стаяла. Нашы селяне дзеляцца астаткамі, і так прабіваюцца людзі з дня на дзень.

Страшна падумаць, што дарагой цэной могуць заплаціць людзі за сваё добрае дзела: ужо пры мне пачалі хварэць на тыфус, дый іншые хваробы, а пры такім палажэньні эпідэміі могуць зьвіць тут сабе моцнае гняздо. Яшчэ горш за ўсё, тое, што пры парадках, тутака ня олькі ні ма доктара, а нават ні таптэкі ні аптэчнаго складу. Катрымаць лекарскую помач, трэба ехаць ў Г — гэта больш за 20 вёрстоў, . Вельмі карыстае з гэтакаго парадку тутэйшы фэльчар; гэты вучоны лекар за найменшае глупства не бярэ менш рубля, дый жыве сябе вялікім панам.

У часе нямецкаго пабыту ў Лі , куды адгэтуль 8 вёрстоў, нямецкіе самалёты аж два разы кідалі бомбы, але вялікіх страт не прычынілі.

У ваколіцах Д зьнішчэны вёскі:

Усяго тутака спалена больш за 80 дамоў.

Жыхары разышліся па суседніх ваколіцах і жывуць, як казаў мне адзін с старэйшых селян, «ня верачы ў лепшые часы, дый просячы у Бога аднаго: сьмерці»

Дзіўным, нават зусім не зразумелым выдалося мне становішчэ паноў абывацелёў перэд нядоляй бездольнаго беларуса. Гэтые паны, жывучы векамі на нашай зямельцы, дабыўшы багацьце потам і крывавай працай нашаго селяніна, цяпер, калі прышла беда, зусім не цекавяцца доляю гэтаго селяніна і ня рупяцца аб якой небудзь помачы ў гэтым нешчасьці гаротнаго народа.

П. Алексюк.

(Далей будзе).

## У чыжыне.

Думы.

Якіе жальбы?! Нашто мне плакаць?
Прад кім, с чаго?
— Сьвет людзкі крывёю зліты,
Цяжкім болям твар парыты, —
Твар яго!

Ну, што-ж няволя? Ніхай, нядоля?
Сьцярплю я сам, —
Там, ў вайне абнятым краі,
Сьмерць зьбірае ураджаі, —
Косіць там!

Ніхай памру я... адзін... ў чужыне...
—Ніхай! гатоў,—
Рам, дзе гром, дзе сьвішчуць кулі,
Сном апошнім шмат заснулі,
—Шмат братоў!..

Пакінь-жэ сэрцэ тужыць аб волі
Цяпер, пакінь!
Зьліся з горам бедных матак,
Жонак, дзетак, ніваў, хатак,
Ці загінь.

Ал. Гарун.

1915 г. 1 марца.

## Юда жэніцца.

Юда жэніцца у полі.
Маладуха яго—Сьмерць.
Ўся пякельніца уволю
Гульню ладзіць. Круць і верць.
Гэй бярыся, зух, у бокі!
Жвавы, рухайся, народ!
У заварожаные скокі
Сып, бязмозгі розны зброд!
Пустамель і прапаведнік,
Шышка важная і моль,
Бочэк золата насьледнік
І абшарпаная голь,
У карагоды у пякельны,
У шалёны у віхор
Зацягніце цягай хмельнай
Плойму цел у соткі гор!
Замест він, у коўш атруты
Лій з зачумленых катлоў!
Сьлёз, крыві, хвароб, пакуты
Не шкадуй, зьмей-душалоў!
Хто у прысядкі заскочэ,
Дробным шагам прабярэць;

# Хіба-ж так не бывае?

Чуеце, як малатарня страшэнна раве, стогне, гудзе і разлегаецца шырокім рэхам, што напэўна чуе цэлы сьвет!? Яна глытае снапы, як ніводзін галодны клёцкі; яна перхаіць, душыцца, выплёвываець камкі памятай саломы, кашляе пылам праз сваё, як памыйная яма, шырокае горла і дрыжыць злосна, і пяе песьню дзікую, разгульную. А ад злосці яе, у такт песьні валюхае сабе тутка-тамка штукарства павука, калышучы асеўшы пыл і сухіх без нутра мух. Гляньце! а вун кругом малатарні ў гуку, ў пыле шнуруюць у гарачковым сьпеху якіесь дзіўные, сьмяхотные фігуры. Ну, да душы, сьмяхотные... Ха—ха! Бачыце, выпоўзла вун адно чорнае, як цень, абкурэнае, як шкелка над капцюгом, охае, чхае. Гляньце! ацірае пот. Ого! і лоб маіць, вачыма бліскае, рукі, ногі... Ах, то-ж гэта чэлавек! Дзіўна, дзіўна... нераўнуючы, як абкурэнае шкелка, як цень... Гм!.. А ці ведаеце вы, што праз абкурэнае шкелка добра відаць зацьменьне сонца?!

---

*Марыля Цымовічанка.* Ведаеце што, сябра Янка, ідзіце лепш дамоў, мяне праводзіць ня трэба; дзякуй вам... катуеце сябе толькі.

*Янук Развала.* Ай, як вы ворага гаворыце. Я шчыра вам кажу, што жадаў-бы, каб ваша кватэра атплыла яшчэ на якую вярсту, а вы: «катуеце», «ідзіце дамоў...»

*Марыля.* Ну добра ужо, добра... А калі будзе сабраньне нашаго гуртка? Нешта я не дачула.

*Янук.* Праз тры дні, у аўторак. Прыходзьце канешня, бо без вас там пуста, глуха. Вы акраса нашаго гуртка; я гарджуся, што з вамі магу працаваць.

*Марыля.* Фу! як вы крывіце душой!

*Янук.* Шчырая і жывучая праўда. (Кароткі маўчок).

*Марыля.* Ня сьмейцеся толькі, калі я вам скажу, што чую у сабе агоньчык і здаволена, што ён часамі мяне грэе і вядзе да вялікаго, безгранічнаго сьвету. О, Божэ моцны! якая асалода памагаць таму, хто абагачывае душу нашу, да каго належыць будучына! Бедны, шэры мужычок, калі ён гляне у душу сваю, каб сонцэ пабачыць і зацепліць гэта сонцэ на зямлі, так як тое на небі красуе?!.

*Янук.* Браво, браво!

*Марыля.* Чэкайце, я перайшла ўжо сваю кватэру. Бывайце здаровы!

*Янук.* Усяго найлепшаго! А каб мы гэта заўтра схадзілі на выстаўку малюнкоў? А?

*Марыля.* Давайце.

*Янук.* А каторай?

*Марыля.* Мм... а першай. (Развіталіся).

. . . . . . . . . . . .

*Мудрая Марылька, Красачка мая!*

Ці ты памятаеш той малюнак: «Працавітая бедната?» Ты стаяла перад ім срогая, паважная, як багіня. Ты сказала: — «Трэба працаваць. Будзе лепш». І я верыў; верыў у любоў, у моц кабеты, у лепшую будучыну. Або той малюнак, дзе шчасьлівая парачк стаіць на узгорку; перад імі шырокі прастор, увесь у цяні, а там, абліваючы шчасьлівых вясёлым любым сьвятлом, плывець к ім залатое сонцэ. — «Гляньце, як ён да вас падобны!» — сказала ты, паказываючы на яго. — «Так, гэта — я, а гэта — ты!» — «Хай будзе згода!» — пачуў я атказ-музыку с тваіх калінавых вусначак... Плывуць перажытые хвіліны, як чароўные сны, і салодзюць і ачышчаюць душу. О Марылька! Люблю я цябе каханьнем цэлаго сьвету! Ты дала мне жыцьцё, надзею, мэту. Ты стварыла у душы маей думку-закон: — «дзе каханьне — там і шчасьце». Трудна мне без цябе. Гадзіна векам здаецца. Скажы, сонейка маё, дзе магу цябе пабачыць? О, горэ-ж маё! калі я дачекаю гэтаго шчасьця?

Твой на заўсёды *Янук.*

*Мілы Янучок!*

Заўтра, 22 ліпня буду у п. Карчэвічоў. Прыходзь а 6 гадзіне. Аттуль пойдзім сустрэчаць усход месіка. Чэкаю нецярпліва той хвіліны.

Твая *Марыля.*

*23 ліпня (Яна да яго).*

Дзівіць мяне твой паступак. Ня мог быць, то трэба было заведаміць. Вы ўсе мужчыны такіе: сягоньня так, а заўтра—накш. Ня ведаю, як другіе, але я палюбіла цябе і буду любіць да сьмерці. Малю цябе, Янучок, ня муч мяне! Можэ ты хворы? — напішы... заспакой... Як твой адрэс? Малю, ратуй, бо згіну, бо скончу самагубствам.

Твая да сьмерці *Марыля.*

*24 ліпня. (Ён да яе).*

Не цямлю, як можна трывожыцца праз такое глупства? Ня быў, бо часу ня меў, вось і ўся музыка, а ты па бабску: «іх» ды «ох...» Работы маю па вушы, хоць пад парубень кладзі, а тут, бытцам на злосьць, дні мігацяць, як цапы у малатарні; кругом-жэ стогн абяздоленых... топяцца... Ай, не маю часу, трэба хоць саломінку падкінуць. Ці-ж не праўда?

Жмець руку *Янук.*

P. S. Прыходзь на сабраньне.

. . . . . . . . . . . .

*З запісак Янука Развалы. 24 ліпня.*

Хай яно выстагне! Шмат жалезнаго бобу пераржвеш, пакуль даб'ешся свайго. І крычыш, і пішыш, і дабро сеіш на ўсе бокі у дзьве жмені, і на ўселякіе манеры выкручываісся, як той смоўж, а ўсё такі Янук Развала які быў, такі і ёсь. Мне трэба славы, столькі трэба, каб мог ёй замазаць дзіркі ад воспы на сваім твары. Не адкладаючы трэба кончыць справу с Тэкляй Храмовічанкай; хоць праціўная яна, як растоптаны таракан, аднак-жэ з запасам дзяўчына. А ідэя мая... ох, і забуяе-ж яна на золаці!.. Ага, добра, што ўспомніў: трэба кальнуць палітычна Даменіка Кастровіча... «Марыля Дымовічанка золатам асыпана...» Ах, каб табе пуста было у мазгох і кішані!

. . . . . . . . . . . .

Вечар. Чырвонае сонцэ не зайшло, але

Хто, як гіцэль, заякочэ,
Вышэй голаў задзярэць.
Кінь свой сорам, чэлавечэ!
Чэсьць сваю не сьцеражы!
Бо раз'юшэнае вечэ
Тут ня ведае мяжы.
Бо людзкіе тут законы
І ня хочуць панаваць.
Болей мукі!. болей стогноў!..
Болей жыцьцяў перэрваць!..
Німа сэрца. Німа жалю.
Німа веры у душы.
Апусьціліс Сьмерці шалі.
Зьвер пануець—так пішы!
Хтосьці плачэ. Хтось сьмяецца,
Шлець праклянцьце у прастор.
І трасецца і нясецца
Заварожэны віхор.
Морэ дыму, морэ крыкоў,
Морэ жышкі і касьцей...
Пруцца, рвуцца трубны клікі:
— Гэй, у скокі, гэй, хутчэй!
Юда жэніцца у полі
Маладуха яго — Сьмерць.
Уся пякельніца у волю
Гульню ладзіць. Круць і верць.

**Ясакар.**

23/III—15 г.

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Беларускае Таварыство.** Віленскае Губэрскае па справах таварыствоў і суполак Прысуство на заседаньні 9 марца сёлетняго году зацьвярдзіло уставу «*Беларускаго Таварыства па аказываньню помачы пацярпеушым ад вайны*». Район працы таварыства абхоплівае губэрніі Віленскую, Гродзенскую, Мінскую, Магілеўскую і Вітэбскую. Таварыство мае права аткрываць свае аддзелы па гарадох і мястэчках гэтаго району. Падпісалі уставу: інжэнер-тэхнолёг В. Іваноўскі, надворны радны В. Радкевіч, кіраўнік бугальтэрскіх курсоў Мохоў, праслухаўшый курс петраградзкаго унівэрсытэту П. Алексюк, чыноўнік Палескай чыгункі Біндзюк і ўласьнік «Беларускай Кнігарні» у Вільні В. Ластоўскі.

**Літоўскі канцэрт.** Камітэт літоўскаго таварыства па аказываньню помачы пацярпеўшым ад вайны уладжывае у нядзелю 19 красавіка у залі гімназіі таварыства пашырэньня сярэдніх навук у Вільні (быўшая гімназія Катхэ) канцэрт з учасьцем хора пад загадам вядомаго літоўскаго компазытара-артысты С. Шымкуса і п. Кімонт, каторая недаўна дапасавала музыку да «Залётоў» В. Марцінкевіча.

**Уцекачы.** Надовічы у Вільню прыбыло 130 уцекачой-жыдоў. Таго-ж самаго дня прыбыло яшчэ 30 сем'яў гэткіх самых уцекачоў.

**Навабранцы**. На сёлетні прызыў навабранцоў с 1916 г. занесена ў спіскі у г. Вільні 472 хрысьціян і 443 жыдоў.

**З „малатка“**. За невыплату рат Петрагр.-Тульскі банк выставіў на продаж с таргоў 7 мая 105 нерухомасьцяў ў віленск. губ. а ў гэтай лічбе 37 нерухомасьцёў гарадзкіх.

**Хворых на тыфус** у Віленшчыні налічываецца цяпер: у лідзкім павеці — 20 душ, у ашмянскім — 36, троцкім—17, вілейскім—34, віленскім 7 і дзісьненскім—9. Аб гэтым паведамляе «Kur. Lit.».

**Конскіе трупы.** Для закопываньня раскіданых у ваколіцах Вільні трупоў згінуўшых і забітых коні наладжэна асабліві лятучы атрад пад загадам вэтэрынарных доктароў.

**Харчы для Вільні.** *У разьніцы* 11 красавіка забілі 43 штукі жывёлы і 8 парсюкоў. *Прывязьлі па чыгунцы:* мукі 4 вагоны, збожа—14, іншых спажыўчых тавароў — 3, угля 2, дрэва — 34, мяса — 4, а такжэ 50 вагоноў з уселякімі іншымі таварамі.

## З Міншчыны.

**Недахват харчоў**. Павэдлуг сабраных афіціяльна вестах, у бліжэйшым часі ў гарадох Мазыры, Бабруўску, Пінску і Мінску можна спадзевацца недахвату жытняй і пшэннай мукі, пшаніцы, солі і масла. Прадукты гэтые трэба канечна атрымаць з мейсцоў, з якіх вываз забаронены, а масла с Сібіры.

**Забастоўкі мясьнікоў.** Надовічы у Мінску, у звязку з адмовай думы падвышыць таксу на мяса, зусім не было на продаж гэтаго тавару. Аказалося, што разьнікі зрабілі забастоў і, хоць было у запасі шмат мяса і жывёлы, не захацелі прадаваць гэтаго жыхаром. Толькі пасьля арышту двух глаўных таргоўшчыкоў мясам — Ледэра і Оксенкруга, спыніўся «мясны» голад

**Жыхароў у Бабруйску** к 1 студню 1914 г. было: мужчын—23,739, кабет — 18,570, а ўсяго 42,309 душ., у гэтым — 25,876 жыдоў. У бабруйскім павеці: мужчын — 168,702, кабет — 163,934, а ўсяго 332,636 душ, у гэтым — 36,138 жыдоў.

**Пажары.** У Міры, Навагр. пав., згарэлі 4 дамы з усімі гаспадарскімі будоўлямі. — У в. Альхоўцы слуцк. пав., згарэлі 23 селянскіе сялібы. Страты 15,000 р.—У двары Бярэзоўка, бабруйск. пав., згарэлі гаспадарскіе будоўлі. Страты 23,140 руб.

**Паводкі**. «Kur. Lit.» пішэ: «Сёлетніе вялікіе сьнягі і вельмі спозьненая весна выклікалі ў цэлым мінскім павеці даўно небывалые паводкі. Асабліва вялікіе шкоды прычыніла вада ў паўночнай часьці павету, дзе былі найбольшые, сьнежные заносы, даходзячые у шмат якіх мейсцох вышынёю да стрэх селянскіх хат. Гвалтоўная адліга прычынілася к таму, што страшэнна паднялася у рэках і возерах вада і вылілася з берагоў. Шмат вельмі усюдах тут знішчожыла мастоў, пазрывала грэблі, пазалівала хаты. Поле, абгалочэнае мейсцамі са сьнегу, пазаносіла пяском. Шкоды вельмі вялікіе. Дарогі — ані прайсьці, ані праехаць, асабліва па цяжкіх землях».

Рэкі Піна, Прыпець і Бярэзіна выйшлі надовічы з берагоў і затапілі поле, сенажаці і прыбярэжные сялібы. У шмат якіх мейсцох знесены масты, вада пазмывала с прыстанёў і берэгоў дровы і інш. лесны тавар. Разводзьдзе на р. Сула затапіла колькі вёсак у рубежэвіцкай воласьці.

Шкоды ад паводкі у Мінску даходзяюць да 200,000 руб. Некаторые жыхары пазбыліся праз паводку усей сваей маетнасьці. Такога разводзьдзя у Мінску не было ўжо 25 год.

**С Піншчыны.** (*Ад нашаго карэспандэнта*). Амаль ва усей Піншчыне за 2 дні перад Вялікаднем выпаў сьнег. Сьнег гэты растаўшы, прычыніў вялікіе паводкі. Сярэдняя Піншчына амаль уся пад вадою, але ў поўночнай — вада ужо сышла і хлебаробы бяруцца за сяўбу; у некаторых вёсках ужо папасевалі аўсы і пачынаюць садзіць бульбу. Шкада толькі, што работнікоў усё ўбывае, — бо 4-го красавіка забралі апалчэнцаў с 1900 па 1905 год; астаўшыеся селяне не падаюць на духу і бяруцца за працу з вераю і надзеяй. Даражыня с кожным месяцам шырыцца. Авёс на насеньне плаціцца да 2 рублёў за пуд.

*Гаротнік.*

## З Вітэбшчыны.

**На харчы.** На павялічэньне вітэбскаго харчэўнаго капіталу атпушчэна с казны 100,000 руб.

**49 двароў „з малатка“**. Вітэбскі дваранскі банк за невыплату у банк належачых рат выставіў на продаж с таргоў 49 двароў у вітэбск. губ., маючые агулам каля 58,500 дзес. зямлі і абдоўжэные на 1,775,000 руб.

**Грабежство.** Надовічы у Дзьвінску урваліся у кантору гарадзкога вадаправоду два замаскаваные злачынцы і, грозючы рэвальвэрамі служачым, захапілі с касы каля 2000 руб.

**Пошэсьць самагубствоў.** «Kur. Lit.» у карэсп. з Дзьвінска паведамляе: «Надовічы мы пісалі, што тутака недаўна павесіўся доктар Капыловіч. У лютым атруціўся так сама малады д-р Хвалевіцкі. У скорым часе пасьля застрэліўся трэці па парадку лекар д-р Рыннэ. Ніводзін з іх не пакінуў па сабе ніякай запіскі аб прычынах самагубства. Агулам думаюць што непамерная праца і страшэн

---

схавалося, як клоп у шчэлку, напіўшыся крыві. Уся прырода, цікаючыся таёмна, расьцеды, як чэлавек па сьмерці, выцягіваецца, каб яшчэ раз глянуць на зьмененае сонцэ; а згледзіўшы яго акарузьне якойсь дзікай фарбай, спудзіцца свае растучай цені ды бардзей туліцца у сьмерканьне, ды хіхочэ, ціханька, ядавіта, с плям недаўнаго ўладара свайго—сонца. Хіхочэ і пакорна прытуліваецца, бо вось краем напоўзае ўжо чорны новы уладар — аграмадная заслона — ноч, але так сама сьмешная, бо ўся ў дзірках, дачэсная. А па рэццэ ў ніз рупна плывуць шчэпкі, сукі, трава...

Човен. Ў чоўне сядзіць Марыля Дымовічанка у побачкі з Дамінікам Кастровічам.

*Марыля.* Глянь, якая ад нас дзіўная цень на рэцэ! Я яе баюся.

*Дамінік.* Чаго, мой жучок? Хутка цені ня будзе, бо настане ноч, і ты яшчэ больш папрыгажэіш.

*Марыля.* Чаму-ж так?

*Дамінік.* А так! бо ўсе кабеты у ночы прыгажэюць. (Цалуюцца). Я цалаваў-бы безупыньня ўвесь век твае калінавые вусначкі Сколькі красы, сколькі павабу! Ведаеш, Марылька: як гляджу я на цябе, дык прыпамінаю Матку Боскую, што ёсь у мяне.

*Марыля.* У цябе Матка Боская?!

*Дамінік.* Чаго-ж ты дзівуіш? Я нават люблю маліцца,

Ну, вось ужо і надулася! Толькі не адстаўляй, вусначэк, а то яны с таго боку, з жыламі, гідкіе, як сырое мяса. Фэ! (Марыля туліцца. Цалуюцца). Хочэш, дык раскажу табе анэкдот?

*Марыля.* Ну! Ха-ха!

*Дамінік.* Раз мужык, згледзіўшы паненак, пачаў дзіваваць, чаму яны такіе зграбные.

*Марыля.* Аха-ха!

*Дамінік.* Слухай-жэ... а яго бабы дык бытцам калоды...

*Марыля.* Уха-хо!.. Ой, любенькі, не магу, ой, годзі!..

*Дамінік.* Хэ, хэ, хэ! Дай-жэ скончыць.

*Марыля.* Ой, якіе-ж яны сьмешные сваей дурнатой!.. Глянь! Глянь!—Палятуха... Бачыш? Згасла!.. Домця, а ты са мною ажэнісся?.. праўда?

. . . . . . . . .

Праз колькі часу чыталі у газэці: «Учора адбывалося вясельле Дамініка Кастровіча с Тэкляй Храмовічанкай...» а ніжэй: «У гасьцініцы «Інтэрнаціонал» якісь адзінюк забіў простытутку, Марылю Дымовічанку. Яе знайшлі з абрэзанымі павекамі, вывернутай шчакой і ўсаджэным відэльцам у сэрцэ.

**Л. Р.**

---

# У хаці.

Весяла пазірае праз маленькае ваконцэ веснавае соўнейка ў хату. Залатой істужкай цягнецца ад вакна да зямлі стоўп пылу.

У хаці ціха. Толькі стукаіць ножкамі дзіця у калысцы. Баўтаіць хлопчык ножкамі і ўсё хочыць каб як злавіць ручкамі чырвоную істужку, што павесіла яму матка дзеля забавы.

У цемным кутку на печы сядзіць зьвесіўшы сівую галаву старая бабуля. На зямлі, сабраўшыся у кучу, грэюцца на сонцы трусы.

— О-о-ох! — цяжка уздыхаіць бабуля.

Трасецца сівая галава, ня сьвецюць старые вочы. Цяжка, цяжка жыць бабулі. Ужо вось пяты год, як яна зіму і лета не злазіць с печы.

Дзіця нечаго заплакала.

Бабуля бардзей заварушылася і палезла с печы далоў.

— Ціхай, Васілька, ціхай, дзіцятка!—кажэ яна: вось злезу, малачка дам.

Цяжка ужо беднай і с печы злесьці. Злесшы с печы, бабуля ўзяла с прыпячка пляшачку з малаком і дала яе дзіцяці. Тое бардзей пачало піць. Цмок! цмок! зацмокала яно вуснамі. Як малако было выпіта, бабуля ўзяла ад дзіцяці пляшачку і паставіла яе узноў на прыпячак, а сама палезла на печ.

— Ох! ох!—узноў уздыхае бабуля.

І роюцца ў бабулі ў галаве сумные думкі. Вось яна ўжо і век канчае, сыноў дачэкала, унукоў, але як служыў бацька у пана, так і дзеці служаць, і ўнукі служыць будуць, бо на чым яны разжывуцца—зямлі усяго толькі агарод маюць.

Уздыхае бабуля, трасе сівой галавой...

Вось ужо селяне гараць пайшлі на свае паласы. І яе-ж Мікалай пайшоў, але толькі на панскае поле. І капаюць у бабулі з вачэй гарачые сьлёзы на пяколак.

Восьмы дзесятак жыве бабуля. Прыгон помніць добра. Сама, як была малая, хадзіла палоць дарожкі каля панскіх пакояў, а пасьля, як вырасла, хадзіла жаць на маргі.

Дзіця у калысцы заснула. Параскідала куды ручку, куды ножку.

Глядзіць бабуля на яго,ківае галавой.

— Дзіцятка маё беднае! вось вырасьцеш, пойдзеш працаваць на людзей. Шчарнеюць твае вусначкі, зжаўцеюць ружовые шчочкі, ручкі зробяцца як дубовые. А там глядзіш і старасьць прыдзе, і станеш ты папірышчам для ўсіх. Будуць даваць кусок хлеба і казаць, што ты не варт яму. Памрэш нейдзе ў чужым кутку, — ніхто і ведаць ня будзе. Пахаваюць пры дарозі, і будзе плакаць толькі вецер над тваей магілай.

І сыпяцца у бабулі з вачэй на пяколак сьлёзы, як боб.

Бабулька мая родненькая! не журыся, гаротніца! Вырасьцеце Васілька, у школку пойдзе, будзе вучыцца. Пазнае, як жывуць людзі на сьвеці, сам навучыцца, як жыць лепей, і ня будуць з яго сьмяяцца, ня будуць паказываць пальцамі, кажучы: глядзіце, во дурэнь ідзе!..

Весяла пазірае праз ваконцэ соўнейка ў хату. Грэюцца трусы на хаці. Сьпіць дзіця ў калысцы, і нейкая усьмешка ня сходзе з яго вусначак. Дрэміць і бабуля на печы.

А на вакне гудзяць мухі: і яны рады вясьне...

**Янка Чарот.**

16/II—15 г.

